А. Р. Агееў (г. Магілёў, Беларусь)

# ЭВАЛЮЦЫЯ СІСТЭМЫ ПАДРЫХТОЎКІ НАСТАЎНІКАЎ ДЛЯ МАГІЛЁЎСКІХ ШКОЛ У XIX-XX СТАГОДДЗЯХ

У юбілейны для Магілёўскага дзяржаўнага абласнога інстытута развіцця адукацыі год нам падаецца важным разгледзіць вытокі і шляхі фарміравання сучаснай сістэмы навучання настаўнікаў. У дадзеным артыкуле не мелася на мэце разгледзіць усе аспекты гісторыі змен у сістэме падрыхтоўкі настаўнікаў на працягу двух апошніх стагоддзяў. Галоўнай задачай мы ставілі разгляд эвалюцыі формаў іх падрыхтоўкі.

Найбольш разнастайныя спосабы атрымання звання настаўнікаў існавалі ў Расійскай імперыі. Многія педагогі мелі духоўна-рэлігійную адукацыю і былі асобамі духоўнага звання. Настаўнікаў для народных школ Беларусі рыхтавалі ў Пецярбургскай духоўнай акадэміі. Магілёўская духоўная семінарыя таксама рыхтавала настаўнікаў. Лепшыя яе гадаванцы працягвалі адукацыю ў акадэміях, астатнія прызначаліся святарамі і царкоўнаслужыцелямі альбо на пасады настаўнікаў і наглядчыкаў у духоўна-навучальныя ўстановы. Закрылі семінарыю ў рэвалюцыйным 1918 г. У Магілёве, Мсціслаўлі, Гомелі і Оршы дзейнічалі павятовыя духоўныя вучэльні, многія гадаванцы якіх настаўнічалі.

У Магілёве з 1778 г. дзейнічала каталіцкай семінарыя, якая рыхтавала юнакоў не толькі для манаскіх ордэнаў, але і манахаў – выкладчыкаў для школ. Дыяцэзія мела не толькі семінарыю, але і акадэмію, якія (семінарыя з 1847, акадэмія з 1882) размяшчаліся ў Санкт-Пецярбургу, але называліся "магілёўскімі" да 1918 г. Так, семінарыя называлася "Магілёўская духоўная семінарыя ў г. Санкт-Пецярбургу". Семінарыя адкрывалася і ў Мсціслаўлі.

Габрэйская рэлігійная адукацыя ў Магілёўскай губерні развівалася разам з павелічэннем габрэйскага насельніцтва. Хедары дзейнічалі ва ўсіх кагалах і прыкагалках. Закон ад 1 сакавіка 1893 г. усталёўваў права выкладання яўрэйскім дзецям закона веры і яўрэйскай мовы, якое набывалася як сведчанне на званне меламеда за тры рублі ў год. У спісе меламедаў губерні, якія атрымалі дазвол Магілёўскай дырэкцыі народных вучылішчаў, на 1 мая 1895 г. фігуравала 658 прозвішчаў. Колькасць меламедаў у Магілёве можна ацаніць у сто пяцьдзясят чалавек [3, с. 35-50].

Сістэма свецкай адукацыі з канца XVIII ст. напачатку павольна, а затым усё больш хутка развівалася і замяняла старую багаслоўскую школу. Школьныя рэформы XIX ст. на беларускіх землях моцна адрозніваліся ад агульнарасійскіх. На беларускіх землях улады імкнуліся перадаць адукацыю ў рукі праваслаўнага духавенства. Настаўнікамі пачатковых вучылішч мелі права быць святары, дыяканы і дзячкі, а таксама свецкія асобы. Але калі ад духоўных асобаў не патрабавалася ніякіх дакументаў, якія пацвярджалі іх падрыхтаванасць, добрую маральнасць і палітычную добранадзейнасць, то свецкія асобы маглі быць настаўнікамі толькі ў тым выпадку, калі атрымлівалі на званне настаўніка ці настаўніцы адмысловы дазвол павятовага вучэльнага савета [3, с. 60].

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Настаўнікі з беларускіх губерняў абмяжоўваліся ў доступе да працы ў навучальных установах, а на іх месцы імкнуліся прызначаць праваслаўных настаўнікаў, якіх падбіралі з "унутраных губерняў", пераважна з ліку выпускнікоў духоўных семінарый. З мэтай прыцягнення настаўнікаў з цэнтральнай Расіі для іх былі ўсталяваныя льготы, у тым ліку 50 % грашовыя надбаўкі да акладаў. Нават мясцовыя праваслаўныя кандыдаты ў настаўнікі праходзілі праверку на добранадзейнасць. Сярод кіраўнікоў значных школьных устаноў вылучаліся велікарускія педагогі.

Пасля закрыцця Віленскага ўніверсітэта па меры росту сеткі школ узмацнялася праблема дэфіцыту падрыхтаваных кадраў настаўнікаў. Для магілёўскіх школ педагогаў рыхтавалі ў Пецярбургскім педагагічным інстытуце, Нежынскім гісторыка-філалагічным інстытуце. Вялікае значэнне мела адкрыццё Віленскага хрысціянскага настаўніцкага інстытута (1874-1918) і Віленскага габрэйскага настаўніцкага інстытута (1875-1918). У другой палове XIX стагоддзя на беларускіх землях дадаткова былі адкрыты чатыры настаўніцкія семінарыі: Маладзечанская (1864), Полацкая (1872), Нясвіжская (1875), Свіслацкая (1876). Полацкая рыхтавала настаўнікаў для Віцебскай і Магілёўскай губерняў. Служылі на тэрыторыі сучаснай Магілёўскай вобласці выпускнікі ўсіх названых семінарый.

У 1885 г. з'явіўся і новы тып навучальных устаноў – двухкласныя царкоўныя настаўніцкія школы: Мілаславічская, Буйніцкая, Канічская, Крычаўская, Нова-Быхаўская, Прыснянская, Пустынская, Шышаўская. Царкоўна-прыходскія школы былі аднакласная з двухгадовым і двухкласныя з чатырохгадовым курсам навучання. Пасля іспыту за курс школы лепшым прысвойвалася званне настаўніка.

Заканчэнне гімназій таксама давала магчымасць стаць настаўнікам. У канцы XIX стагоддзя на беларускіх землях працавала сем мужчынскіх гімназій, у іх ліку Магілёўская (1809) і Гомельская, дзве прагімназіі, у тым ліку Бабруйская. У 1906 г. адкрыта мужчынская гімназія ў Мсціслаўлі. У 1912 г. у горадзе Магілёве мелася пяць гімназій, у тым ліку тры прыватныя жаночыя гімназіі. Па заканчэнні дадатковага старэйшага курсу выпускніцы гімназій атрымлівалі дыплом хатніх настаўніц і тым маглі забяспечыць сабе стабільны самастойны заробак. Жаночыя гімназіі, якія належалі ведамству імператрыцы Марыі (Магілёў, 1865), таксама давалі магчымасць займацца педагагічнай дзейнасцю. Гімназісткам, якія скончылі поўны курс, даваўся атэстат на званне хатняй настаўніцы, а лепшым – хатняй настаўніцы і права без іспыту пастуніць на педагагічныя курсы. З 1908 г. пры Марыінскай гімназіі быў адкрыты педагагічны клас са славесным і матэматычным аддзяленнямі. Пасля яго заканчэння дзяўчыны атрымлівалі права працаваць настаўніцамі ў пачатковай школе.

Значную ролю ў сістэме адукацыі займала Магілёўскае жаночае вучылішча духоўнага ведамства. Пасля рашэння Святейшага сінода (1867) аб выкладанні педагогікі пры вучэльні быў адкрыты сёмы педагагічны клас. Многія з гадаванак сталі настаўніцамі і доўгія гады паспяхова працавалі на ніве асветы Магілёўскай вобласці. Навучальная ўстанова была зачынена ў 1918 г.

У пачатку XX ст. школа дынамічна развівалася. Але рэакцыйная палітыка царызму ставіла нацыянальныя раёны ў горшае становішча, у параўнанні з метраполіяй. Усеагульны перапіс 1897 г. паказаў, што толькі чвэрць насельніцтва Расіі была пісьменнай. На нацыянальных ускраінах сітуацыя была яшчэ горшай. У Магілёўскай губерніі пісьменнымі былі 21,8 % насельніцтва. Спрабуючы падняць узровень народнай адукацыі, урад Расіі з 1900 па 1914 гг. павялічыў выдаткі на патрэбы Міністэрства народнай асветы ў 4,75 разы. На Магілёўшчыне з'явіліся земскія школы. Да пачатку Першай сусветнай вайны ў губерні колькасць навучальных устаноў рознай ведамаснай прыналежнасці, якія давалі пачатковую адукацыю, вырасла да 3 360. Гэта быў велізарны крок наперад у справе развіцця народнай адукацыі. Нават ва ўмовах вайны земствы ставілі задачу пераходу да ўсеагульнай адукацыі ў губерні. Меркавалася да 1918 г. ажыццявіць агульнадаступнае пачатковае навучанне дзяцей.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

У межах Віленскай навучальнай акругі ў гэты часназіраўся востры недахоп кваліфікаваных настаўнікаў. Нярэдка ў школах працавалі адстаўныя салдаты, асобы з пачатковай адукацыяй. У 1909 г. у Магілёўскай губерні з 988 настаўнікаў народных вучылішч 560 не мелі педагагічнай адукацыі, а ў 1913 г. – 1 381 настаўнік з 1 889 [1, с. 384-385].

У пачатку XX стагоддзя на тэрыторыі Беларусі былі адкрыты яшчэ пяць настаўніцкіх семінарый: мужчынская ў Рагачове, жаночыя ў Барысаве, Оршы, Гомелі і Бабруйску. У 1910 г. настаўнікаў для школ, у тым ліку і Магілёўскай губерні, стаў рыхтаваць Віцебскі настаўніцкі інстытут, а з 1913 па 1918 гг. – Магілёўскі настаўніцкі інстытут. Паралельна ўрад узяў курс на паскораную падрыхтоўку настаўнікаў на педагагічных курсах і шляхам здачы экзаменаў на званне настаўніка. Звычайна перад экзаменамі праводзіліся месячныя курсы павышэння кваліфікацыі. Вялікую ролю іігралі кароткатэрміновыя педагагічныя курсы. На беларускіх землях у пачатку стагоддзя было адкрыта пяць аднагадовых курсаў (па 50 вучняў) пры гарадскіх вучылішчах, якія ў 1908 г. пераўтварылі ў двухгадовыя [3, с. 376-377].

У 1906 г. жанчыны з вышэйшай адукацыяй атрымалі права выкладання ўсіх прадметаў у гарадскіх вучылішчах і ў малодшых класах сярэдніх школ. У старэйшых класах яны мелі права навучаць дзяцей замежным мовам. Мужчыны з вышэйшай адукацыяй маглі працаваць выкладчыкамі сярэдніх навучальных устаноў пасля пробных урокаў.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі пры ўсіх педагагічных навучальных установах арганізуюцца розныя курсы па падрыхтоўцы педагагічных кадраў для савецкай школы. У 1917-20 гг. ствараюцца педагагічныя курсы трох тыпаў: сталыя з двума-трыма гадамі навучання, аднагадовыя з дзесяцімесячным тэрмінам навучання і кароткачасовыя на два, тры месяцы. Яны дзейнічалі ў Бабруйску, Горках, Магілёве.

У 1918 г. была абвешчана Беларуская Народная Рэспубліка. Германскае камандаванне перадало ў яе кампетэнцыю сярод іншага асвету і культуру. У гэты час працавала ад 150 да 350 беларускіх школ, у тым ліку гімназіі. Настаўнікаў рыхтавала семінарыя і настаўніцкі інстытут. У магілёўскіх газетах публікаваліся аб'явы аб арганізацыі дзевяцімесячных курсаў для падрыхтоўкі настаўнікаў беларускіх школ па ініцыятыве Беларускай рады, курсаў для вывучэння замежных моў (французскай, нямецкай, англійскай, польскай) і г. д. [3, с. 164].

Пасля ўступлення ў Магілёў войскаў Чырвонай Арміі ў снежні 1918 г. Магілёўскі настаўніцкі інстытут быў пераўтвораны ў педагагічны інстытут – вышэйшую навучальную ўстанову з чатырохгадовым тэрмінам навучання. Інстытут меў тры аддзяленні і рыхтаваў настаўнікаў для школ першай і другой ступені, а таксама работнікаў дашкольных устаноў. Настаўнікаў для школ другой ступені вучылі на фізіка-матэматычным, сацыяльна-гістарычным, біялагічным, літаратурна-мастацкім і геаграфічным цыклах. У 1919 г. педагагічныя інстытуты пераўтварыліся ў інстытуты народнай адукацыі з больш шырокім профілем выпускаемых спецыялістаў. Яны таксама адносіліся да вышэйшых навучальных устаноў. У 1921 г. інстытуты былі пераўтвораны ў практычныя інстытуты народнай адукацыі. Востры сацыяльна-эканамічны крызіс пасля Грамадзянскай вайны прывёў да закрыцця ў 1923 г. інстытута, які перадаў сваю матэрыяльную базу педагагічнаму тэхнікуму [2].

У 1923 г. на базе Магілёўскага практычнага інстытута народнай адукацыі быў створаны Беларускі дзяржаўны педагагічны тэхнікум. У красавіку 1937 г. педагагічны тэхнікум быў перайменаваны ў педагагічнае вучылішча. Для падрыхтоўкі работнікаў дашкольных устаноў у 1935 г. быў адкрыты педагагічны тэхнікум у Мінску, які перавялі ў Магілёў у 1936 г. У тым жа годзе дадзеную навучальную ўстанову перайменавалі ў Магілёўскае беларускае педагагічнае вучылішча. У 1949 г. Беларускае дзяржаўнае педагагічнае вучылішча было рэарганізавана ў Беларускае дзяржаўнае педагагічнае вучылішча фізічнага выхавання і старэйшых піянерскіх важатых. У 1956 г. у выніку

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

аб'яднання двух вучэльняў было створана дашкольна-педагагічнае вучылішча, якому ў 1970 г. было прысвоена імя К. Д. Ушынскага. У 1989 г. яно становіцца вышэйшым педагагічным, у 1992 г. – педагагічным каледжам, у 2004 г. – сацыяльна-гуманітарным каледжам пры МДУ імя А. А. Куляшова.

У 1921 г. ў Бабруйску пачаў працаваць педагагічны тэхнікум з чатырохгадовым тэрмінам навучання, які ў 1933 г. быў перайменаваны ў педагагічнае вучылішча. З 1949 па 1954 гг. на базе вучылішча ў Бабруйску працаваў настаўніцкі інстытут, які рыхтаваў настаўнікаў для 5-7-х класаў агульнаадукацыйнай школы. У інстытуце было тры факультэты: беларускай і рускай моў і літаратуры, фізікі і матэматыкі. На яго базе ў 1954-57 г. зноў запрацавала педагагічнае вучылішча.

Са жніўня 1920 г. на базе Мсціслаўскай настаўніцкай семінарыі былі адкрыты трохгадовыя педагагічныя курсы. З 1921 г. на іх базе быў адкрыты чатырохгадовы педагагічны тэхнікум, які працаваў да 1954 г.

У 1932 г. было адкрыта Крычаўскае педагагічнае вучылішча, якое рыхтавала выхавальнікаў дашкольных устаноў. З лютага 1944 г. да пераводу ў г. Горкі ў 1960 г. тут вялася падрыхтоўка настаўнікаў пачатковых класаў.

У 1930 г. было прынята рашэнне аб аднаўленні педагагічнага інстытута ў Магілёве. У адпаведнасці з ім 1 кастрычніка 1930 г. распачаў дзейнасць Магілёўскі дзяржаўны педагагічны інстытут. У 1937 г. пры педагагічным інстытуце быў створаны настаўніцкі інстытут з двухгадовым тэрмінам навучання, які працаваў да 1953 г. Пры педагагічным інстытуце ажыццяўлялася ў летні перыяд павышэнне кваліфікацыі. Лагічным вынікам развіцця навучальнай установы стала пераўтварэнне 30 чэрвеня 1997 г. педагагічнага інстытута ва ўніверсітэт. З 2000 г. пры ўніверсітэце дзейнічае Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў. З 2004 г. у структуру ўніверсітэта ўвайшоў Горацкі педагагічны каледж (педагагічнае вучылішча 1975-2004). ВНУ за гады свайго існавання падрыхтавала каля 50 тысяч спецыялістаў пераважна для галіны народнай асветы [2].

Такім чынам, у XIX – пач. XX ст. у Расійскай імперыі назіраўся пераход да свецкай сістэмы падрыхтоўкі настаўнікаў, якая не мела строгай іерархічнай структуры. Яе плюсам была гібкасць і варыятыўнасць, але ў выніку настаўнікі мелі задужа розны ўзровень кваліфікацыі. Назіраўся востры недахоп кваліфікаваных настаўнікаў. Пасля рэформаў 1920-30-х гг. паступова склалася савецкая двухузроўневая (вучылішча – інстытут) і дастакова жорсткая сістэма, якая пачала рэфармавацца ў 1990-я гг.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Асвета і педагагічная думка ў Беларусі: са старажытных часоў да 1917 г. [Тэкст]. – Мінск : Народная асвета, 1985. – 464 с.
2. Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова : мінулае і сучаснасць [Тэкст]. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2003. – 260 с.
3. Науменко, В. В. Очерки истории образования Могилевщины [Текст] / В. В. Науменко, В. С. Богданов, А. Р. Агеев ; под общ. ред. Л. С. Смотрицкого. – Могилев : МГОИРО, 2012. – 504 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова